*ВНУ – школе*

Дзмітрый ПАЎЛАВЕЦ
Святлана ЧАЙКОВА

# ФАНЕТЫКА, АРФАЭПІЯ, АКЦЭНТАЛОГІЯ, ГРАФІКА

## ТЭСТ ПА РАЗДЗЕЛАХ

### ВАРЫЯНТ 1

### Частка А

**А1.** Адзначце рады, у якіх усе гукі глухія:
1) [к’], [ч], [л]; 4) [т], [ц’], [к];
2) [с], [з’], [м]; 5) [х], [ф], [с’].
3) [дз’], [п], [ш];

**А2.** Адзначце рады, у якіх усе гукі санорныя:
1) [л’], [т], [ж]; 4) [н’], [с], [х];
2) [в’], [м’], [н]; 5) [ц’], [г], [л].
3) [р], [й], [в];

**А3.** Адзначце рады, у якіх ёсць гістарычныя чаргаванні зычных:
1) славіць – слаўлю; 4) плакаць – плачу;
2) палёт – у палёце; 5) пісьмо – у пісьме.
3) плаціць – плачу;

**А4.** Адзначце словы, у якіх усе зычныя гукі глухія:
1) іншасказанне; 4) падчэпка;
2) пешаход; 5) абтрэсці.
3) каўчук;

**А5.** Адзначце словы, у якіх усе зычныя гукі мяккія:
1) узлезці; 4) з’яднанне;
2) квітнець; 5) ельнік.
3) дзевяць;

**А6.** Адзначце словы, у якіх ёсць свісцячыя зычныя гукі:
1) сшытак; 4) езджу;
2) развіццё; 5) дзьме.
3) падарожжа;

**А7.** Адзначце словы, у якіх ёсць шыпячыя зычныя гукі:
1) шыпшына; 4) на лодачцы;
2) асіна; 5) завіхаешся.
3) яшчарка;

**А8.** Адзначце, у якіх словах правільна вызначана колькасць гукаў:
1) аб’ява (6); 4) дзядуля (6);
2) свіцязьскі (9); 5) едзьце (4).
3) дожджык (7);

**А9.** Адзначце словы, у якіх гукаў больш, чым літар:
1) авіяцыя; 4) роўнядзь;
2) гарадскі; 5) гаючы.
3) спяваць;

**А10.** Адзначце словы, у якіх ёсць выбухны гук [ґ]:
1) анекдот; 4) джыгіт;
2) разгон; 5) паджгаць.
3) дрогкасць;

**А11.** Адзначце словы, у якіх літара *ю* абазначае два гукі:
1) спяваюць; 4) юнга;
2) дзюшэс; 5) пюпітр.
3) налью;

**А12.** Адзначце словы, у якіх літара *я* абазначае два гукі:
1) перыяд; 4) капялюш;
2) вясна; 5) аб’ява.
3) явар;

**А13.** Адзначце словы, у якіх літара *і* абазначае гук [ы]:
1) брат і сястра; 4) над ільнозаводам;
2) на ігрышчы; 5) звышімклівы.
3) смех і грэх;

**А14.** Адзначце словы, у якіх побач стаяць два галосныя гукі:
1) інтэлектуал; 4) алеут;
2) біясфера; 5) задыяк.
3) страус;

**А15.** Адзначце словы, у якіх вымаўленне зычных адпавядае напісанню:
1) гарадскі; 4) брацкі;
2) сцежка; 5) талер.
3) хісткі;

**А16.** Адзначце словы, у якіх вымаўляецца падоўжаны гук [ч]:
1) ламачча; 4) водаправодчык;
2) чайнік; 5) разведчык.
3) адчуванне;

**А17.** Адзначце словы, у якіх спалучэнне літар *дз*, *дж* абазначае адзін гук:
1) надземны; 4) адзінота;
2) уджаліць; 5) паджгаць.
3) аджылак;

**А18.** Адзначце словы, у якіх гукі, абазначаныя вылучанымі літарамі, вымаўляюцца мякка:
1) *з*мена; 4) *з*гінуць;
2) *з*вер; 5) *з*віць.
3) *с*вята;

**А19.** Адзначце рады, у якіх усе вылучаныя галосныя з’яўляюцца націскнымі:
1) м*ы*сленне, нік*у*ды; 4) замч*ы*шча, п*е*рапіс;
2) туз*а*ць, к*а*ўчук; 5) паслан*е*ц, *а*лфавіт.
3) мал*е*нькі, н*е*пагадзь;

**А20.** Адзначце словы, у якіх націск пастаўлены правільна:
1) адз*і́*наццаць; 4) укр*а́*інцы;
2) в*ы́*падак; 5) крых*у́*.
3) рэм*е́*нь;



***Дзмітрый Дзмітрыевіч Паўлавец*** *– мовазнаўца, гісторык мовы. Закончыў гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны (1976). Кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны. Займаецца пытаннямі гісторыі беларускай літаратурнай мовы, нацыянальнай тэрміналогіі, тапанімікі.*

***Святлана Віктараўна Чайкова*** *– мовазнаўца. Кандыдат філалагічных навук (2001). Дацэнт кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны. Закончыла гісторыка-філалагічны факультэт гэтай навучальнай установы (1988) і аспірантуру пры ёй (1999). Даследуе антрапанімічную і дыялектную лексіку, методыку выкладання беларускай мовы.*



**А21.** Адзначце рады слоў з першым націскным складам:

1) мармур, кухар;
2) памятаць, агент;
3) нафтавы, прыняць;
4) агрэст, дакумент;
5) сівы, статут.

**А22.** Адзначце словы з другім націскным складам:

1) найміт;
2) статуя;
3) рубель;
4) ільняны;
5) дасыта.

**А23.** Адзначце рад, у якім кожная літара на пісьме абазначае толькі адзін гук:

1) н, а, п, с, й;
2) ў, р, а, б, ж;
3) р, е, л, ь, х;
4) і, ё, д, я, з;
5) ы, ў, о, р, э.

**А24.** Адзначце, якія характарыстыкі адпавядаюць вылучанаму гуку ў слове *жы[ц']ё*.

1) зычны, санорны, мяккі, падоўжаны, шыпячы;
2) зычны, шумны, глухі, цвёрды, свісцячы;
3) зычны, глухі, мяккі, падоўжаны, свісцячы;
4) зычны, звонкі, мяккі, санорны, свісцячы;
5) зычны, глухі, зацвярдзелы, падоўжаны, шыпячы.

**А25.** Адзначце, які фанетычны працэс (агульны для ўсяго раду слоў) адбываецца ў словах *загадка*, *дарожка*, *казка*, *рэзкі*, *сведка*:

1) азванчэнне глухога гука;
2) асіміляцыя па глухасці;
3) змякчэнне цвёрдага гука;
4) прыпадабненне свісцячага да шыпячага;
5) аглушэнне і змякчэнне гукаў (адначасова ў кожным слове).

**А26.** Адзначце, які фанетычны працэс (агульны для ўсяго раду слоў) адбываецца ў словах *песня*, *змена*, *смеласць*, *цвёрды*, *лазня*:

1) азванчэнне глухога гука;
2) аглушэнне звонкага гука;
3) прыпадабненне свісцячага да шыпячага;
4) асіміляцыя па мяккасці;
5) аглушэнне і змякчэнне гукаў (адначасова ў кожным слове).

**А27.** Адзначце нумары, у якіх правільна паказана вымаўленне слова:

1) не хоча – [н’эхо́ча];
2) будзьце – [бу́ц’э];
3) на дарожцы – [надаро́сцы];
4) схема – [с’х’э́ма];
5) бездакорна – [б’эздако́рна].

**А28.** Адзначце нумары, у якіх правільна паказана вымаўленне слова:

1) суседскі – [сус’э́цк’і];
2) сцвярджаць – [сц’в’арджа́ц’];
3) поспех – [по́с’п’эх];
4) спадчына – [спа́тчына];
5) футбол – [фудбо́л].

**А29.** Адзначце правільныя сцверджанні:

1) гукі мовы, якія служаць сродкам адрознення слоў, называюцца фанемамі;
2) паводле ўдзелу губ у вымаўленні галосныя бываюць лабіялізаваныя і нелабіялізаваныя;
3) пераход галосных [о] і [э] у першым складзе перад націскам у [а] адбываецца як у словах славянскага паходжання, так і запазычаных;
4) у беларускай мове націск у словах заўсёды падае на апошні склад;
5) падоўжаныя зычныя перадаюцца падвойным напісаннем літар.

## Частка В

**В1.** Запішыце словам, колькі гукаў [т] у прыказцы *Трапіў у нерат, ні ўзад ні ўперад.*

**В2.** Устанавіце адпаведнасць паміж словам і характарыстыкай зычных у ім. Адказ запішыце ў выглядзе літара-лічбавага спалучэння.

А. здранцвець;
Б. руказак;
В. пругка;
Г. блізка;

1) у слове два глухія зычныя гукі;
2) у слове тры мяккія зычныя гукі;
3) у слове тры глухія зычныя гукі;
4) у слове тры звонкія зычныя гукі;
5) у слове чатыры мяккія зычныя гукі.

**В3.** Запішыце тэрмін, які выкарыстоўваецца для назвы гукаў [дж], [ч], [дз’], [ц’], [ц].

**В4.** Рашыце фанетычнае ўраўненне *басма* + … = *зняць* + *сняць*. Запішыце прапушчанае слова.

**В5.** Запішыце падоўжаны гук, які абазначаецца трыма літарамі.

**В6.** Запішыце словам, колькі санорных гукаў у беларускай мове.

**В7.** Запішыце, як называецца найкарацейшая адзінка моўнай плыні, якая складаецца з галоснага гука або спалучэння галоснага з зычнымі і вымаўляецца адным штуршком паветра.

**В8.** Запішыце, як называецца спецыяльны спосаб запісу слоў, які дакладна перадае іх вымаўленне.

**В9.** Запішыце, як называецца раздзел мовазнаўства, які вывучае сістэму націску ў мове.

### ВАРЫЯНТ 2

### Частка А

**А1.** Адзначце рады, у якіх усе гукі глухія:
1) [п’], [с], [х’]; 4) [дж], [д], [р];
2) [ш], [ч], [к’]; 5) [ў], [п], [н].
3) [р], [л], [в’];

**А2.** Адзначце гукі, якія на пісьме можна перадаць літарай *т*:
1) [д]; 4) [дж];
2) [т]; 5) [ц].
3) [т’];

**А3.** Адзначце словы, у якіх гукі [о], [э] чаргуюцца з нулём гука:
1) дзёран; 4) сем;
2) гаёк; 5) леў.
3) лясок;

**А4.** Адзначце рады, у якіх ёсць гістарычныя чаргаванні зычных:
1) снягір – снежны;
2) паласкаць – палашчу;
3) краявід – аб краявідзе;
4) цукерка – аб цукерцы;
5) лічба – аб лічбе.

**А5.** Адзначце словы, у якіх усе зычныя гукі мяккія:
1) звесці; 4) мяняешся;
2) скеміць; 5) схіліць.
3) здзяйсненне;

**А6.** Адзначце словы, у якіх ёсць свісцячыя зычныя гукі:
1) селядзец; 4) зжаты;
2) зжоўклы; 5) з шапкаю.
3) жыццяпіс;

**А7.** Адзначце словы, у якіх ёсць шыпячыя зычныя гукі:
1) смяешся; 4) калоссе;
2) расшчодрыцца; 5) вучыцца.
3) спеў;

**А8.** Адзначце словы, у якіх правільна вызначана колькасць гукаў:
1) заінець (7); 4) медзь (4);
2) павільён (8); 5) язь (3).
3) ёўня (4);

**А9.** Адзначце словы, у якіх гукаў больш, чым літар:
1) калодзеж; 4) мазаіка;
2) адчуванне; 5) пошчак.
3) язмін;

**А10.** Адзначце словы, у якіх літары *е*, *ё* абазначаюць два гукі:
1) пёры; 4) паштальён;
2) ёмкі; 5) нябёсы.
3) пад’езд;

**А11.** Адзначце словы, у якіх літара *ю* абазначае два гукі:
1) нюанс; 4) пюрэ;
2) раз’юшаны; 5) юшка.
3) цюльпан;

**А12.** Адзначце словы, у якіх літара *я* абазначае два гукі:
1) праязны; 4) вяргіня;
2) гняздо; 5) бяз’ядзерны.
3) акіян;

**А13.** Адзначце словы, у якіх літара *і* абазначае два гукі:
1) іскрысты; 4) Івянец;
2) вераб’і; 5) заінелы.
3) з ільвом;

**А14.** Адзначце рады, у якіх ёсць гістарычныя чаргаванні галосных:
1) бяру – збор – збіраць; 4) дрогкі – дрыжаць;
2) веснавы – вясна; 5) зацірка – церці.
3) восень – асенні;

**А15.** Адзначце словы, у якіх вымаўленне зычных адпавядае напісанню:
1) сцэна; 4) купаешся;
2) збор; 5) экзэмпляр.
3) поўнач;

**А16.** Адзначце словы, у якіх ёсць падоўжаны гук [н]:
1) маўленне; 4) гасцінны;
2) Таццяна; 5) манна.
3) рунню;

**А17.** Адзначце словы, у якіх спалучэнне літар *дз*, *дж* абазначае адзін гук:
1) адзвінець; 4) гавяджы;
2) падзяка; 5) падземны.
3) дзядзька;

**А18.** Адзначце словы, у якіх гукі, абазначаныя вылучанымі літарамі, вымаўляюцца мякка:
1) ра*з*гінаць; 4) *с*недаць;
2) ра*с*хіліць; 5) ра*с*цвітаць.
3) *с*ківіца;

**А19.** Адзначце рады, у якіх усе вылучаныя галосныя з’яўляюцца націскнымі:
1) аб*е*руч, фурм*а*нка; 4) жардз*і*на, вэлюм;
2) граб*а*р, цыг*а*ны; 5) за*і*нець, зап*е*чак.
3) бар*ы*ш, блук*а*ць;

**А20.** Адзначце словы, у якіх націск пастаўлены правільна:
1) кварт*а́*л; 4) крапів*а́*;
2) к*а́*менны; 5) в*у́*сы.
3) спін*а́*;

**А21.** Адзначце рады слоў з першым націскным складам:

1) вага, наледзь; 4) рубель, мезенец;
2) жальба, статус; 5) засланка, дзеяч.
3) фартух, цяжар;

**А22.** Адзначце словы з другім націскным складам:
1) існую; 4) каўчук;
2) крупяны; 5) абагульніць.
3) дзеяч;

**А23.** Адзначце словы з трэцім націскным складам:
1) арахіс; 4) індустрыя;
2) збажына; 5) ярына.
3) непісьменнасць;

**А24.** Адзначце, якія характарыстыкі адпавядаюць вылучанаму гуку ў слове *кало[с̄ʼ]е*.
1) зычны, санорны, мяккі, падоўжаны, шыпячы;
2) зычны, шумны, глухі, цвёрды, свісцячы;
3) зычны, глухі, мяккі, падоўжаны, свісцячы;
4) зычны, звонкі, мяккі, санорны, свісцячы;
5) зычны, санорны, зацвярдзелы, падоўжаны, шыпячы.

**А25.** Адзначце, якія фанетычныя працэсы (агульныя для ўсяго раду слоў) адбываюцца ў словах *касьба*, *просьба*, *жаніцьба*, *малацьба*, *барацьба*:
1) асіміляцыя па звонкасці;
2) аглушэнне звонкага гука;
3) змякчэнне цвёрдага гука;
4) прыпадабненне свісцячага да шыпячага;
5) аглушэнне і змякчэнне гукаў (адначасова ў кожным слове).

**А26.** Адзначце, якія фанетычныя працэсы (агульныя для ўсяго раду слоў) адбываюцца ў словах *снег*, *след*, *сцяг*, *злёг*, *услед*:
1) азванчэнне глухога гука;
2) аглушэнне звонкага гука;
3) змякчэнне цвёрдага гука;
4) прыпадабненне свісцячага да шыпячага;
5) аглушэнне і змякчэнне гукаў (адначасова ў кожным слове).

**А27.** Адзначце гукі, якія на пісьме можна перадаць літарай *с*:
1) [ш]; 4) [з];
2) [зʼ]; 5) [ц].
3) [сʼ];

**А28.** Адзначце словы, у якіх няправільна перададзена транскрыпцыя слова:
1) людскі – [лʼ ýцкʼі];
2) трыснёг – [трысʼнʼóх];
3) на вокладцы – [на вóклатцы];
4) адчуваць – [атчувáцʼ];
5) носьбіт – [нóзʼбʼіт].

**А29.** Знайдзіце правільныя сцверджанні:
1) усе зычныя гукі ўтвараюцца толькі пры дапамозе шуму;
2) націскныя галосныя ў беларускай мове маюць выразнае гучанне;
3) дзеканне і цеканне адбываецца як у словах славянскага паходжання, так і запазычаных;
4) многія аднолькавыя беларускія і рускія словы адрозніваюцца месцам націску;
5) беларускае пісьмо літарна-гукавое.

### Частка В

**В1.** Запішыце, як называюцца гукі, якія ўтвараюць склады.

**В2.** Устанавіце адпаведнасць паміж словам і характарыстыкай зычных гукаў у ім. Адказ запішыце ў выглядзе літара-лічбавага спалучэння.
А. сямібор’е;
Б. падпісчык ;
В. скубці;
Г. каўчэг;
1) у слове два глухія зычныя гукі;
2) у слове тры мяккія зычныя гукі;
3) у слове тры глухія зычныя гукі;
4) у слове два шыпячыя зычныя гукі;
5) у слове чатыры глухія зычныя гукі.

**В3.** Запішыце тэрмін, які выкарыстоўваецца для назвы гукаў [ж], [ш], [дж], [ч], [р], [ц] (не з мяккага *т*).

**В4.** Рашыце фанетычнае ўраўненне *срэбны* + … = *сляпіць* + *зляпіць*. Запішыце прапушчанае слова.

**В5.** Запішыце словам, колькі разоў сустракаецца гук [ш] у прыказцы *Каб не ежка ды не адзежка, была б грошай поўна дзежка*.

**В6.** Запішыце словам, колькі свісцячых гукаў у беларускай мове.

**В7.** Запішыце, як называецца найменшая (непадзельная) адзінка мовы, якую мы можам вымавіць і пачуць.

**В8.** Запішыце, як называецца раздзел мовазнаўства, у якім вывучаюцца нормы літаратурнага вымаўлення.

**В9.** Запішыце, як называецца раздзел мовазнаўства, у якім вывучаецца сукупнасць усіх сродкаў для абазначэння вуснай мовы на пісьме.

### АДКАЗЫ

**Варыянт 1.**

**Частка А: А1.** 4, 5; **А2.** 2, 3; **А3.** 1, 3, 4; **А4.** 2, 4; **А5.** 1, 3; **А6.** 2, 5; **А7.** 1, 3; **А8.** 1, 4; **А9.** 1, 5; **А10.** 1, 4, 5; **А11.** 1, 3, 4; **А12.** 1, 3, 5; **А13.** 1, 4, 5; **А14.** 1, 3, 4; **А15.** 3, 4, 5; **А16.** 1, 3, 4, 5; **А17.** 2, 4, 5; **А18.** 1, 2, 3, 5; **А19.** 1, 3; **А20.** 2, 5; **А21.** 1, 2; **А22.** 3, 5; **А23.** 5; **А24.** 3; **А25.** 2; **А26.** 4; **А27.** 3, 5; **А28.** 1, 3, 5; **А29.** 1, 2, 5.

**Частка В: В1.** чатыры; **В2.** А5, Б4, В3, Г1; **В3.** афрыкаты; **В4.** пасма; **В5.** ддз; **В6.** адзінаццаць; **В7.** склад; **В8.** транскрыпцыя; **В9.** акцэнталогія.

**Варыянт 2.**

**Частка А: А1.** 1, 2; **А2.** 1, 2, 4, 5; **А3.** 2, 3, 5; **А4.** 1, 2, 4; **А5.** 1, 3, 4; **А6.** 1, 3; **А7.** 2, 5; **А8.** 1, 2, 5; **А9.** 3, 4; **А10.** 2, 3, 4; **А11.** 2, 5; **А12.** 1, 3, 5; **А13.** 1, 2, 5; **А14.** 1, 4, 5; **А15.** 1, 2, 3; **А16.** 1, 3, 5; **А17.** 2, 3, 4; **А18.** 4, 5; **А19.** 1, 3, 4; **А20.** 1, 4, 5; **А21.** 2, 5; **А22.** 3, 5; **А23.** 2, 3, 5; **А24.** 3; **А25.** 1; **А26.** 5; **А27.** 1, 2, 3; **А28.** 3, 4; **А29.** 2, 4, 5.

**Частка В: В1.** галосныя; **В2.** А2, Б4, В5, Г1; **В3.** зацвярдзелыя; **В4.** зрэбны; **В5.** чатыры; **В6.** восем; **В7.** склад; **В8.** арфаэпія; **В9.** графіка.